Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
__________ А.А. Корбут
«05» 02 2017 г.
Рэгістрацыйны № УД 22/эвуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ХОРАЗНАЎСТВА

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-18 01 01 Народная творчасць(па напрамках),*
*спецыялізацыі 1-18 01 01-01 01 "Харавая музыка акадэмічная*

2017 г.

Вучэбная праграма складзена з улікам патрабаванняў адукацыйнага стандарту Рэспублікі Беларусь ОСВО 1-18 01-01 2013 Народная творчасць па напрамках. Рэгістрацыйны нумар С 18-1-67/17 вуч.

**Складальнік:**
*А.А.Свірыдовіч*, дацэнт кафедры харавога і вакальнага мастацтва ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**Рэцэнзенты:**

*кафедра* харавога дырыжыравання ўстановы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі”

*М.П.Дрынеўскі*, кіраўнік дзяржаўнай установы “Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Г.І.Цітовіча”, прафесар, народны артыст Беларусі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* харавога і вакальнага мастацтва ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 7 ад 28.03.2017);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 5 ад 28.06.2017);

Адказны за выпуск *А.А.Свірыдовіч*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У працэсе падрыхтоўкі студэнтаў па спецыялізацыі 1-18 01 01-01 01 “Харавая музыка акадэмічная” вучэбная дысцыпліна “Хоразнаўства” займае адно з асноўных месцаў.

Вучэбная дысцыпліна “Хоразнаўства” базіруецца ў першую чаргу на ведах, атрыманых студэнтамі пры вывучэнні вучэбных дысцыплін харавога цыклу – “Харавы клас”, “Дырыжыраванне”, а таксама музычна-тэарэтычных вучэбных дысцыплін – “Тэорыя музыкі”.

Засваенне раздзелаў вучэбнай дысцыпліны “Хоразнаўства” павінна забяспечыць фарміраванне наступных прафесійных кампетэнцый:

Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый спецыяліста

арганізацыйна-кіраўніцкая дзейнасць

ПК-3. Забяспечваць шматбаковыя сувязі з грамадкасцю ў працэсе работы, удзельнічаць у распрацоўцы рэкламнай і друкаванай прадукцыі.

ПК-4. Рыхтаваць даклады, паведамленні і іншую дакументацыю ў галіне народнай творчасці і ўдзельнічаць у іх рэпрэзентацыі.

навукова-даследчая дзейнасць

ПК-14. Аналізаваць перспектывы і напрамкі захавання і развіцця народнай творчасці.

ПК-17. На навуковай аснове арганізоўваць сваю творчую прафесійную дзейнасць, валодаць найноўшымі навуковымі распрацоўкамі, а таксама сучаснай інфармацыяй у сферы мастацкай культуры.

ПК-18. Ажыццяўляць нагляд за бытаваннем розных відаў і жанраў народнай творчасці ў мэтах іх аховы і пераемнасці.

ПК-19. Ведаць прынцыпы і прыёмы збірання, сістэматызацыі, абагульнення і выкарыстання інфармацыі для правядзення навуковых даследванняў у галіне народнай творчасці.

Выканальніцкая дзейнасць

ПК-23. Планаваць рэпертуар уласных мастацкіх (музычных) твораў.

ПК-24. Працаваць з крыніцамі рэпертуару, літаратурай па народнай творчасці.

ПК-25. Арганізоўваць этапы працэсу выканання мастацкіх (музычных) твораў для эстэтычнага выхавання і фарміравання высокамастацкіх густаў насельніцтва.

ПК-26. Выступаць у якасці акцёра-выканаўцы ў прафесійных і аматарскіх музычных калектывах, драматычных тэатрах, музычных тэатрах, тэатрах-студыях, на радыё, тэлебачанні, у канцэртных установах.

Творчая дзейнасць

ПК-27. Рабіць уласныя аранжыроўкі, інструментоўкі, апрацоўкі і пераклады для харавых калектываў, аркестраў, ансамблей.

ПК-28. Самастойна падбіраць рэпертуар, фарміраваць канцэртную праграму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-29. Рыхтаваць творчыя выступленні харавых (інструментальных) калектываў і весці канцэртную работу ў рэгіёне і па-за яго межамі.

*Асноўная мэта вучэбнай дысцыпліны* – авалоданне тэарэтычнымі ведамі па гісторыі харавога мастацтва і тэорыі хоразнаўства, падрыхтоўка кіраўніка акадэмічнага хору, фарміраванне творчай асобы будучага хормайстра.

*Асноўныя задачы вучэбнай дысцыпліны:*

– развіццё ўменняў і навыкаў, неабходных для практычнай работы з харавым калектывам;

– авалоданне рознымі метадамі вакальна-харавой працы;

– выхаванне навыкаў усебаковага аналізу харавых партытур, здольнасці да абагульнення, умення працаваць з музыказнаўчай і нотнай літаратурай.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны спецыяліст павінен *ведаць*:

– гісторыю развіцця харавых спеваў;

– жанравую спецыфіку харавога калектыву;

– харавы калектыў, яго склад, тыпы і віды;

– характарыстыку пеўчых галасоў у хоры;

– рэгістры, дыяпазоны, тэсітуры ў хоры;

– вакальна-харавую структуру хору;

– пеўчы голас, пабудову галасавога апарату, механіку пеўчага працэсу;

*умець*:

– стварыць харавы калектыў і вызначыць выканаўцаў;

– падабраць рэпертуар хору;

– арганізаваць пастановачную работу ў харавым калектыве;

– стварыць ансамбль у хоры.

Для аналізу харавых партытур прапануецца выкарыстоўваць харавыя сачыненні розных эпох, стыляў, жанраў, якія вывучаюцца ў класе харавога дырыжыравання. Гэта, безумоўна, садзейнічае асэнсаванаму разуменню суадносін тэорыі і практыкі неабходных пры дадзенай форме работы.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Хоразнаўства” адведзена усяго 146 гадзін, з якіх 70 – аўдыторныя заняткі (40 лекцый, 30 семінарскія).

Рэкамендуемая форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| № п/п | Раздзелы і тэмы | Колькасць аўд.гадзін | | | Колькасць часоў | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | усяго | Лекц. | Сем | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| | *Уводзіны* | 1 | 1 | | | |
| **Раздзел I. Гісторыя харавога мастацтва** | | | | | | |
| 1. | *Тэма 1.* Харавое мастацтва. Харавая творчасць. Характэрныя рысы і асаблівасці харавога мастацтва | 1 | 1 | | | |
| 2. | *Тэма 2.* Напрамкі развіцця харавога выканання ў Расіі і Беларусі. Харавыя калектвы ў краіне | 2 | 2 | | | |
| 3. | *Тэма 3.* Стылі і жанры вакальна-харавога мастацтва. Віды і жанры харавой музыкі | 4 | 2 | | 2 | заданне для самаст. работы |
| **Раздзел II. Тэорыя хоразнаўства** | | | | | | |
| 4. | *Тэма 4.* Пеўчыя галасы. Класіфікацыя. Харавыя калектвы, іх склады. Тыпы хароў і іх выканальніцкія магчымасці. Растаноўка хора. | 2 | 3 | | | |
| 5. | *Тэма 5.* Галасавы апарат. Гігіена голасу і галасавы рэжым | 2 | 2 | | | |
| 6. | *Тэма 6.* Дыханне ў харавым выканальніцтве | 4 | 2 | 2 | | |
| 7. | *Тэма 7.* Распяванне ў харавым калектыве | 8 | 2 | 4 | 2 | практ. заданне |
| 8. | *Тэма 8.* Строй хору і яго віды | 4 | 2 | 2 | | |
| 9. | *Тэма 9.* Харавая фактура | 8 | 2 | 4 | 2 | практ. заданне |
| 10 | *Тэма 10.* Ансамбль хору, яго віды і элементы | 4 | 2 | 2 | 2 | практ. заданне |
| 11 | *Тэма 11.* Дыкцыя ў хоры | 6 | 2 | 2 | 2 | практ. заданне |
| 12 | *Тэма 12.* Тэмп у харавым выканальніцтве | 2 | 2 | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 13 | *Тэма 13*. Асноўныя дырыжорска-выканальніцкія сродкі мастацкай выразнасці | 4 | 2 | | | |
| 14 | *Тэма 14*. Прыёмы харавога выкладання | 4 | 2 | 2 | | практ. заданне |
| 15 | *Тэма 15*. Работа над харавым творам. Этапы работы | 8 | 2 | 4 | 2 | практ. заданне |
| 16 | *Тэма 16*. Аналіз харавой партытуры | 6 | 2 | 2 | 2 | практ. заданне |
| | | | | | | экзамен |
| **Усяго** | | 70 | 32 | 24 | 14 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны.*

Мэта, задачы і змест дысцыпліны. Роля і месца дысцыпліны ў падрыхтоўцы спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне.

## Раздзел I. Гісторыя харавога мастацтва

### *Тэма 1. Харавое мастацтва. Харавая творчасць. Характэрныя рысы і асаблівасці харавога мастацтва*

Роля мастацтва ў духоўным развіцці асобы. Музычнае выкананне сродкамі харавога мастацтва. Калектыўны, масавы пачатак, сувязь са словам, наяўнасць дырыжора, музычны інструмент (пеўчы голас), развіццё харавога мастацтва ў суадносінах з гістарычнай эпохай – характэрныя рысы харавога мастацтва.

Акадэмічнае і народнае харавое выканаўства. Характэрныя рысы і асаблівасці. Асноўныя патокі развіцця харавога мастацтва: прафесійнае і аматарскае харавое выканаўства.

### *Тэма 2. Напрамкі развіцця харавога выканання ў Расіі і Беларусі. Харавыя калектывы ў краіне*

Напрамкі харавога мастацтва ў харавым выкананні:

а) царкоўна-пеўчы напрамак. Узаемасувязь развіцця харавога выканальніцтва і гісторыі. Культура Кіеўскай Русі (IX – XП ст.ст.), Вялікага Ноўгарада (XШ – XIУ ст.ст.). Знаменны распеў, кандакарныя спевы, раннія формы шматгалосся, строчныя спевы. Масква – цэнтр царкоўна-пеўчай культуры XV–XVII ст.ст. Партэсны канцэрт. Прыдворная пеўчая капэла і Маскоўскі сінадальны хор;

б) свецкае харавое выканальніцтва (прыватныя і аматарскія калектвы ў дарэвалюцыйнай Расіі);

в) народныя харавыя спевы.

Стварэнне пасля 1917 г. новых формаў харавога выканальніцтва (ансамбль песні і танца, народныя хары).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Стварэнне дырыжорска-харавых факультэтаў у кансерваторыях Масквы і Петраграда. Адкрыццё музычнага тэхнікума ў Мінску, кафедры дырыжорска-харавога факультэта ў Мінскай кансерваторыі.

Камернае харавое мастацтва – новая форма харавога выканання 70–90-х гадоў XX ст. Сувязь яго з жыццём. В.Мінін і яго дзейнасць у стварэнні першага камернага хору. Камерныя хары ў Беларусі.

Выдатныя дзеячы харавой культуры П.Г.Часнакоў, Н.М.Данілін, Г.А.Дзмітрэўскі, А.В.Аляксандраў, А.В.Свешнікаў, У.Чарнушэнка, В.У.Роўда, М.Б.Дрынеўскі, Л.Б.Яфімава.

Вядучыя харавыя калектывы Беларусі – прафесійныя і аматарскія.

Конкурсы харавой музыкі ў нашай краіне і за мяжой.

*Тэма 3. Стылі і жанры вакальна-харавога мастацтва.*
*Віды і жанры харавой музыкі*

Паняцце аб стылі і жанры.

Адметныя рысы эпохі Адраджэння, стыляў барока, класіцызма, імпрэсіянізма, рэалізма, экспрэсіянізма.

Віды харавой творчасці – хары без суправаджэння (a cappella) і хары з інструментальным суправаджэннем.

Жанры харавой музыкі: харавая песня, харавая мініяцюра, хор буйной формы, аратарыяльна-кантатны жанр, оперна-харавы жанр, харавая апрацоўка, харавы пераклад. Узаемапранікненне жанраў.

## Раздзел II. Тэорыя хоразнаўства

*Тэма 4. Пеўчыя галасы. Класіфікацыя. Харавыя калектывы, іх склады. Тыпы хароў і іх выканальніцкія магчымасці. Растаноўка хора*

Паняцце аб пеўчым і прафесійным голасе. Дыяпазоны пеўчых галасоў. Элементы пеўчага голасу: сіла гука, тэмбр, палётнасць, пявучасць, дыханне, дыяпазон. Рэгістравая будова галасоў. Задачы прафесійнага навучання спевакоў. Класіфікацыя галасоў харавых партый:

Партыя Сапрана – лірыка – каларатурнае, лірычнае, драматычнае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Партыя Альтоў – лірычнае і драматычнае мецца-сапрана, контральто.

Партыя Тэнараў – лірычныя і драматычныя тэнары.

Партыя Басоў – драматычныя і лірыка – драматычныя барытоны, бас, актавісты.

Дыяпазоны харавых партый. Паняцце аб хоры як калектыве спевакоў. Элементы харавой гучнасці. Склад хору, яго тып і від. Выканальніцкія магчымасці змешанага, жаночага, мужчынскага саставу хора.

Растаноўка хора (класічная і інш.). Рэверберацыя памяшкання.

*Тэма 5. Галасавы апарат. Гігіена голасу і галасавы рэжым*

Функцыянальны прынцып будовы галасавога апарата. Узаемадзеянне гартані і дыхальнага апарату.

Гукаўтваральны і артыкуляцыйны аддзелы галасавога апарату (глотка, ратавая поласць, поласць носа).

Роля рэзанатараў. Гігіена голасу і галасавы рэжым. Жыццёвы і прафесійны рэжым, азначаныя гігіенічныя правілы. Распарадак працы, адпачынку, харчавання, фізічных практыкаванняў і г.д. Невралагічна-псіхічная нагрузка.

*Тэма 6. Дыханне ў харавым выканальніцтве*

Асаблівасці пеўчага дыхання. Фазы і тыпы пеўчага дыхання. Ніжняробернае – дыяфрагмальнае дыханне – як найбольш аптымальнае для вакальна-харавых спеваў.

Асноўныя задачы пеўчага выдыха. Выкарыстанне дыхання ў залежнасці ад даўжыні музычнай фразы і мастацкіх патрабаванняў. Асаблівасці ланцуговага дыхання. Роля дыяфрагмы. Бязгукавыя практыкаванні. Выкарыстанне розных гімнастык (артыкуляцыйнай і дыхальнай).

Атака гука як сродак мастацкай выразнасці і вакальнай тэхнікі ў суадносінах са зместам і характарам харавога твора, сродак уздзеяння на галасавы аппарат. Віды атакі: мяккая, цвёрдая, прыдыхальная. Аснова гукаўтварэння – мяккая атака.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 7. Распяванне ў харавым калектыве*

Распяванне хора. Асноўныя задачы распявання хора – падрыхтоўка галасавога аппарату да спеваў, развіццё і ўдасканаленне вакальна-харавых навыкаў.

Умовы пры якіх неабходна пачынаць распяванне хору – прымарная зона, дынаміка (p, mp, mf), тэмп (andante, moderato).

Кампаненты харавога практыкавання: паўторнасць, вызначаная арганізацыя, мэтанакіраванасць.

Даўжыня распявання, прынцып паступовасці, дыяпазон, дынаміка, гукавысотнасць, эмацыянальнасць.

Тыпы вакальных практыкаванняў: распявання на некаторыя галосныя, склады, зачыненым ротам, з розным рытмічным малюнкам, гукавядзеннем, голасавядзеннем, штрыхамі, гарманічныя паслядоўнасці (інтэрвалы, акорды), вакалізы, урыўкі з харавых твораў. Роля інструментальнага суправаджэння пры распяванні. Практычнае выкананне на фартэпіяна вакальных практыкаванняў ва ўсіх танальнасцях па тонах храматычнай гамы ўверх і ўніз. Вакальнасць дырыжорскага жэста.

*Тэма 8. Строй хору і яго віды*

Паняцце аб харавым строі як працэсе чыстага інтанавання з апорай на лад. Віды строю: меладычны (гарызантальны) і гарманічны (вертыкальны).

Інтанаванне ступеней мажорнага і мінорнага ладоў. Інтанаванне інтэрвалаў і акордаў. Умовы захавання строю ў хоры.

Уплыў на строй метрарытму, тэмпу, лада, фактуры харавога складання, тэсітурных умоў, дынамікі. Залежнасць чысціні строю ад вакальных навыкаў хору (дыхання, гукаўтварэння). Танальнасць харавога твора і прыёмы настройкі хору.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 9. Харавая фактура*

Паняцце аб харавой фактуры, як сукупнасці сродкаў музычнага выкладання. Асноўныя функцыі харавых партый: меладычная, гарманічная, кантрапунктычная. Тыпы фактур: мелодыка-манадычная, мелодыка-падгалосачная, мелодыка-гарманічная, гамафонна-гарманічная, гарманічная (акордавая), паліфанічная (імітацыйная, падгалосачная, кантрастная), змяшаная.

Залежнасць тыпа фактуры ад зместу і характару харавога твора. Прыёмы работы над рознымі тыпамі фактуры.

*Тэма 10. Ансамбль хору, яго віды і элементы*

Рознае значэнне слова “ансамбль”. Ансамбль хору, умовы яго дасягнення. Суадносіны якаснага і колькаснага складу галасоў. Ансамбль прыватны і агульны.

Элементы харавога ансамбля: тэмбравы, дынамічны, рытмічны, тэмпавы, дакцыённы, інтайнацыйны. Ансамбль натуральны і штучны. Уплыў тесітуры на ансамбль хора. Стварэнне ансамбля пры розных тыпах харавых фактур.

Уплыў складу выканаўцаў на ансамбль хору:

– ансамбль хору і саліруючых галасоў.

– ансамбль хору і інструментальнага суправаджэння (пры рознай функцыі хору).

– ансамбль хору, саліруючых галасоў і інструментальнага суправаджэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 11. Дыкцыя ў хоры*

Паняцце аб харавой дыкцыі як асэнсаваным і выразным вымаўленні слоў у спевах.

Асаблівасці вакальна-харавой дыкцыі. Пеўчая артыкуляцыя. Правілы фанетыкі і  арфаэпіі, культуры і логікі мовы. Асноўныя памеры вершаванай мовы: харэй, дактыль, амфібрахій, анапест.

Характар вымаўлення літаратурнага тэксту ў спевах: распеў, дэкламацыя, вакалізацыя, скарагаворкі. Работа над літаратурным тэкстам у хоры: сэнсавая і тэхнічная. Праца над галоснымі ў спевах. Праца хормайстра над вымаўленнем зычных у спевах. Рэдукаванне галосных у спевах. Дыкламацыя паэтычнага тэксту.

*Тэма 12. Тэмп у харавым выканальніцтве*

Метр – парадак чаргавання моцных і слабых доляў у такце. Памеры – простыя, складаныя, сіметрычныя і несіметрычныя. Тэмп у харавым творы. Роля, значэнне. Метранамічныя абазначэнні тэмпа. Пяць асноўных груп тэмпавых абазначэнняў. Тэмпы вельмі павольныя, павольныя, мерныя, хуткія і вельмі хуткія. Залежнасць тэмпа ад фактуры, формы, мелодыкі, гармоніі, паэтычнага тэксту.

*Тэма 13. Асноўныя дырыжорска-выканальніцкія сродкі мастацкай выразнасці*

Асноўныя дырыжорска-выканальніцкія сродкі: агогіка, дынаміка, артыкуляцыя, фразіроўка.

Агогіка – рух музыкі, як часовая арганізацыя. Роль тэмпа, мэтра, рытма.

Дынаміка харавога твора – залежнасць яе ад характару, зместу твора.

Да артыкуляцыі (выразнасць выканання) адносяцца: характар выканання, гукавядзенне (штрыхі), цэзурнасць (паузы, дыханне, цэзуры).

Фразіроўка, яе залежнасць ад пабудовы музычнага і паэтычнага тэксту. Прыёмы дасягення адзінства музычнай і паэтычнай фразіроўкі.

Роля дырыжыравання ў працэсе кіравання калектыўным выкананнем.

Асаблівасці харавога дырыжыравання (роля мімікі, кісцей рук і пальцаў, твара і інш.).Комплекс навыкаў, ведаў, неабходных дырыжору. Значэнне дырыжорскай волі, пачуцця рытму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 14. Прыёмы харавога выкладання*

Паняцце аб харавой фактуры як сукупнасці выразных сродкаў хору.

Прыёмы харавога выкладання падзяляюцца на тры группы.

*Да першай групы* адносяцца прыёмы, звязаныя з выкарыстаннем выразных магчымасцей складу хору.

1) агульнахаравое выкладанне (tutti);

2) выкладанне няпоўным складам хора;

3) выкладанне харавымі групамі;

4) выкарыстанне "чыстых тэмбраў" харавых партытур;

5) падзел партый (divisi).

*Да другой групы* – прыёмы, вызначаемыя суадносінамі харавых груп (або партый).

1) выкаладанне мелодыі рознымі партыямі хора;

2) перадача мелодыі з адной партыі ў другую;

3) паступовае ўключэнне ў выкананне харавых груп або партый;

4) паступовае выключэнне з выканання харавых груп або партый;

5) прыёмы супастаўлення;

6) абасабленне харавых партый або груп;

7) прыём дубліравання;

8) харавая педаль;

9) перакрыжаванне.

*Трэцяя група* ўключае каларыстычныя прыёмы выкладання.

1) спевы басоў-актавістаў;

2) спевы закрытым ротам;

3) спевы на галосны гук, на паўторны склад;

4) гукаімітаванне, прыём "эха";

5) меладыкламацыя;

6) запаўненне (кластэр);

7) шумавыя эфекты: пляскі, тупат і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 15. Работа над харавым творам. Этапы работы*

Падбор рэпертуара з улікам склада хору, вакальна-тэхнічнага і мастацкага ўзроўню.

Праца над харавым творам – асноўны змест усёй творчай дзейнасці дырыжора і калектыву.

Асноўныя тры этапы работы дырыжора над харавым творам:

1) падрыхтоўчая работа дырыжора, самастойнае вывучэнне твора;

2) рэпетыцыйная праца з хорам;

3) канцэртнае выкананне.

І. *Падрыхтоўчая работа дырыжора*. Метады самастойнай работы хормайстра над творам:

а) выкананне яго на фартэпіяна;

б) вакальна-інтанацыйнае засваенне;

в) дырыжорска-тэхнічнае засваенне;

г) аналіз харавой партытуры.

Дасканалая папярэдняя падрыхтоўка харавых партый да вывучэння харавога твора.

П. *Рэпетыцыйная праца з хорам (працэс вывучэння твора):*

а) знаёмства калектыву з творам (паказ сачынення, апавяданне аб аўтарах твора, зместу сачынення, асноўных асаблівасцях);

б) тэхнічнае засваенне твора (работа над чысцінёй інтанацыі, пераадоленне рытмічных цяжкасцей, работа над дынамікай і дыкцыяй);

в) праца над творам у мастацкім плане (вызначэнне галоўнай тэмы твора і работа над вобразам);

г) прынцып паступовасці асваення харавой партытуры (апошні перыяд працы перад канцэртным выкананнем).

Ш. *Канцэртнае выканнне* як натуральнае заканчэнне ўсёй працы дырыжора над харавым творам. Роля дырыжора. Неабходнасць валявога і упэўненага адчування дырыжора пры эмацыянальнай і творчай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўсхваляванасці. Папярэдняя настройка дырыжора і калектыву перад канцэртам. Разнастайнасць канцэртных праграм (святочныя, тэматычныя і інш.). Канцэртная праграма як адно сачыненне. Асаблівасці пабудовы канцэртнай праграмы. Залежнасць ад характару твора, танальнасці сачынення. Роля канцэртных выступленняў у жыцці калектыву.

*Тэма 16. Аналіз харавой партытуры*

Паняцце аб харавой партытуры, як супольнага запісу харавых партый твора. Залежнасць харавой партытуры ад склада выканаўцаў, колькасць харавых партый, фактуры твора. Запіс літаратурнага тэксту ў партытуры. Аналіз харавой партытуры, як адзін з метадаў вывучэння харавога твора. Тыпы аналіза: кароткая анатацыя, разгорнуты аналіз.

План разгорнутага аналізу па раздзелах:

1) агульныя звесткі аб творы і яго аўтарах;

2) аналіз літаратурнага тэксту;

3) аналіз музычна-выразных сродкаў;

4) аналіз харавой фактуры (вакальна-харавы аналіз);

5) выканальніцкі план;

6) заключэнне.

Галоўная мэта аналіза – выяўленне харавых выканальніцкіх сродкаў, неабходных для раскрыцця зместу твора.

Раздзелы плана, прысвечаныя аналізу харавой фактуры і распрацоўцы выканальніцкага плану, з’яўляюцца асноўнымі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Асафьев, Б.В.* О хоровой музыке / Б.В.Асафьев. – Л.: Музыка, 1987. – 225 с.

2. *Анисимов, А.* Дирижер – хормейстер / А.Анисимов. – Л.: Музыка, 1976. – 160 с.

3. *Балашов, В.* Поэтическое слово и вокальная интонация. Работа в хоре / В.Балашов. – М.: Музыка, 1977. – 65 с.

4. *Вопросы* вокальной педагогики: сб. ст. – Л.: Музыка, 1982. – Вып. 6. – 180 с.

5. *Емельянов, В.В.* Развитие голоса. Координация и тренаж / В.В.Емельянов. – СПб.: Лань, 2007. – 191 с.

6. *Живов, В.* Хоровое исполнительство / В.Живов. – М.: Владос, 2003. – 272 с.

7. *Живов, В.* Теория хорового исполнительства / В.Живов. – М.: Эдиториал УРСС, 1998. – 288 с.

8. *Живов, В.* Трактовка хорового произведения / В.Живов. – М., Сов. Россия, 1986. – 126 с.

9. *Иконникова, Л.Н.* Интерпретаторская культура хорового дирижера / Л.Н.Иконникова; науч. ред. Ю.Д.Златковский. – Мн.: Изд. центр БГУ, 2005. – 143 с.

10. *Левандо, П.П.* Хороведение. Основы вузовского курса / П.П.Левандо. – Л.: Музыка, 1971. – 280 с.

11. *Левандо, П.П.* Анализ хоровой партитуры / П.П.Левандо. – Л.: Музыка, 1965. – 55 с.

12. *Кееригу, О.П.* Хороведение: учеб. пособие / О.П.Кееригу. – СПб.: СПбГУКИ, 2004. – 187 с.ю

13. *Малышева, Н.М.* О пении: метод. пособие (Из опыта работы с певцами) / Н.М.Малышева. – М.: Музыка, 2001. – 168 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*14. Менабени, А.Г.* Методика обучения сольному пению / А.Г.Менабени. – М.: Просвещение, 1987. – 95 с.

*15. Минин, В.* К проблеме подготовки дирижеров хора / В.Минин // Труды ГМПИ им. Гнесиных. – М., 1975. – Вып. 19. – 17–26 с.

*16. Морозов, В.П.* Искусство резонансного пения / В.П.Морозов. – М.: Моск. гос. консерватория им. П.И.Чайковского, 2002. – 145 с.

*17. Осеннева, М.С.* Хоровой класс и практическая работа с хором / М.С.Осеннева, В.А.Самарин. – М.: Академия, 2003. – 192 с.

*18. Соколов, Вл.* Работа с хором. – 2-е изд. / Вл.Соколов. – М.: Музыка, 1983. – 192 с.

*19. Пигров, К.* Руководство хором / К.Пигров. – М.: Музыка, 1964. – 217 с.

*20. Чесноков, П.Г.* Хор и управление им. – 3-е изд. / П.Г.Чесноков. – М.: Гос. муз. изд-во, 1961. – 239 с.

*Дадатковая*

*1. Бугасов, С.* Душе моя: произведения для смешанных составов хоров / С.Бугасов. – Мн.: Изд. Вараксин А.Н., 2009. – 112 с.

*2. Век маладосці*: харавыя цыклы беларускіх кампазітараў / укл. А.А.Свірыдовіч. – Мн.: Зорны верасень, 2009. – 188 с.

*3. Вопросы* вокальной педагогики: сб. ст. – Л.: Музыка, 1982. – Вып. 6. – 180 с.

*4. Гажэўская, Т.С.* Табе, Прачыстая Багародзіца! / Т.С.Гажэўская. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 327 с.

*5. Гукі* Бацькаўшчыны / уклад. А.А.Свірыдовіч. – Мн.: Тэхнапрынт, 2004. – 216 с.

*6. Гэта* наша Радзіма: вакальныя творы беларускіх кампазітараў на вершы У.Карызны / укл. С.Ярохіна. – Мн.: Беларусь, 1998. – 120 с.

*7. Духоўная* харавая музыка / уклад. А.В.Пякуцька, З.Л.Леановіч, В.П.Маеўская. – Мн.: Бел. ун-т культуры, 1996. – 156 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. *Ерохина, С.К.* Хоровой класс и хор в школе. Хоровая музыка XVI–XVIII вв. / С.К.Ерохина. – Мн.: Мастацкая літаратура, 2008. – 143 с.

9. *Как* прекрасен этот мир! / сост. Б.Кожевников. – Мн.: Беларусь, 2002. – 232 с.

10. *Каціўся* вяночак: бел. нар. песні / укл. А.А.Свірыдовіч. – Мн.: Выд. Вараксін А.М., 2006. – 72 с.

11. *Назарова*, *Е.П.* Хоровой практикум: учеб.пособие. – Мн.: БГПУ, 2002. – 157 с.

12. *Нова* радасць стала / уклад. А.Пякуцька, З.Леановіч, В.Маеўская. – Мн.: БелІПК, 1995. – 59 с.

13. *Памяти* А.В. Свешникова. Статьи. Воспоминания / сост. С.С.Калинин. – М.: Музыка, 1998. – 328 с.

14. *Салавей* спявае: хары, песні на вершы У.Карызны / укл. С.Ярохіна. – Мн.: Беларусь, 1990. – 160 с.

15. *Сокровищница* русской духовной музыки / сост. Б.Г.Тевлин. – М.: Музыка, 2000. – 167 с.

16. *Харавы* канцэрт / уклад. А.Пякуцька, Я.Рэутовіч, З.Леановіч, В.Маеўская. – Мн.: Беларусь, 1999. – 167 с.

17. *Харавая* музыка: апр. бел. нар. песень / уклад. А.В.Пякуцька, З.Л.Леановіч, В.П.Маеўская. – Мн.: Бел. ун-т культуры, 1996. – 236 с.

18. *Хоровой концерт*: произведения зарубежных композиторов XVI–XX вв. / сост. С.Ерохина. – Мн.: Лимариус, 2000. – 176 с.

19. *Чабарок:* рэпертуарны зборнік для хароў і вакальных ансамбляў / уклад. Л.Ярашэвіч, С.Ярохіна. – Мн.: Ін-т праблем культуры, 1991. – 72 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Перачэнь рэкамендаваных сродкаў дыагностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці**

Кантроль вучэбнай дзейнасці студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне “Харазнаўства” ажыццяўляецца з дапамогай наступных форм дыягностыкі:

– вусны апрос пад час заняткаў;
– практычныя заданні;
– заданні для самастойнай працы;
– кантроль самастойнай працы;
– экзамен.

У якасці эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць кіраванню ведамі, а таксама набыццю вопыта самастойнага вырашэння рознабаковых задач, неаходна адзначыць:

– праектныя тэхналогіі;
– тлумачальна-элюстрацыйны метад ў спалучэнні з рэпрадукцыйным;
– метад параўнальнага аналізу;
– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусія, вучэбныя дыбаты і іншыя актыўныя формы і метады);
– метад аналізу канкрэтных сітуацый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Крытэрыі адзнак**

| Балы | Паказчыкі адзнак |
|---|---|
| 1-2 (адзін-два) | Адсутнасць ведаў значнай часткі тэарэтычнага матэрыялу, вельмі дрэнная арыентаванасць у пытаннях хоразнаўства, фрагментарныя тэарэтычныя веды. Значныя памылкі ў выкарыстанні прыкладаў і спецыяльнай тэрміналогіі, адсутнасць ведаў аб творчасці прадстаўнікоў харавой культуры. |
| 3 (тры) | Недастатковы абаснаваны адказ, інфармацыя агульнага зместу. Недастатковае выкарыстанне мастацкіх прыкладаў і спецыяльнай тэрміналогіі. Адсутнасць ведаў аб харавой творчасці прадстаўнікоў харавой культуры. Адказы на пытанні сведчаць аб павярхоўным характары ведаў. |
| 4 (чатыры) | Няпоўнае валоданне тэарэтычным матэрыялам і яго разумення, недастатковае выкарыстанне музычных прыкладаў і спецыяльнай тэрміналогіі. Адсутнасць ведаў па пытаннях вакальна-харавой работы. |
| 5 (пяць) | Веданне тэарэтычнага матэрыялу, але з сур'ёзнымі памылкамі ў паслядоўнасці выказвання. Недастатковае валоданне музычнымі прыкладамі і спецыяльнай тэрміналогіяй. |
| 6 (шэсць) | Адказ на тэарэтычныя пытанні няпоўны, але без істотных недакладнасцей і памылак. Наяўнасць шэрагу памылак пры выкананні практычных практыкаванняў па розных формах вакальна-харавой працы. Выкарыстанне дастатковай колькасці музычных пракладаў і спецыяльнай тэрміналогіі. |
| 7 (сем) | Правільны, але не разгорнуты адказ на тэарэтычныя пытанні.<br>Выкарыстанне дастатковай колькасці музычных прыкладаў і спецыяльнай тэрміналогіі. Адзначаецца засваенне асноўнай |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | літаратуры, якая рэкамендавана вучэбнай праграмай, але не ў поўным аб'ёме. |
| 8 (восем) | Дакладная па сэнсу, але не бездакорная па форме дэманстрацыя тэарэтычных ведаў, амаль беспамылковае выкананне практычных заданняў (розныя практыкаванні). Добрае валоданне музычнымі прыкладамі і спецыяльнай тэрміналогіяй. |
| 9 (дзевяць) | Вольнае валоданне матэрыялам у галіне харавой культуры, разнастайнасць музычных прыкладаў. Дакладнае валоданне спецыяльнай тэрміналогіяй, імёнамі, датамі, назвамі твораў. |
| 10 (дзесяць) | Бездакорнае валоданне ведамі па гісторыі харавога мастацтваі тэорыі хоразнаўства, надзвычай дакладнае выкананне практычных практыкаванняў па розных формах вакальна-харавой працы. Адказы пытанні вызначаюцца лагічнасцю і паслядоўнасцю, дэманструюць здольнасць да самастойнага мыслення. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ